# АКТУАЛЬНЫЕ ПРОБЛЕМЫ ИСТОРИИ И КУЛЬТУРЫ

ВЫПУСК 5



# АКАДЕМИЧЕСКАЯ НАУКА: ИСТОРИЯ И ЛЮДИ

НАЦИОНАЛЬНАЯ АКАДЕМИЯ НАУК БЕЛАРУСИ
Институт истории

# АКТУАЛЬНЫЕ ПРОБЛЕМЫ ИСТОРИИ И КУЛЬТУРЫ

СБОРНИК НАУЧНЫХ СТАТЕЙ

*Основан в 2018 году*

ВЫПУСК 5

# АКАДЕМИЧЕСКАЯ НАУКА: ИСТОРИЯ И ЛЮДИ

Минск
«Беларуская навука»
2024

pawet.net

УДК [94+008+001](476+470)(082)

Сборник включает материалы по истории развития академической науки Беларуси и России с конца XVIII в. до настоящего времени, а также исследования личности ученого, специфики и значения его деятельности.

Рекомендован профессиональным историкам, специалистам в области истории науки, преподавателям, студентам, а также всем, кто интересуется историей.

Составители:

М. В. Глеб, М. А. Краснова, Ж. В. Рзаева, О. В. Медведева,
А. А. Денисевич, А. С. Барнюк

Редакционная коллегия:

И. В. Жилинская (главный редактор),
А. А. Челядинский, В. В. Фрольцов, А. М. Литвин, В. В. Зданович,
В. А. Пилецкий, А. Л. Самович, М. В. Глеб, М. А. Краснова

Рецензенты:

доктор исторических наук В. Е. Снапковский,
кандидат исторических наук С. С. Юрецкий

*Издание подготовлено в рамках выполнения Государственной программы научных исследований на 2021–2025 гг. «Общество и гуманитарная безопасность белорусского государства» (научный руководитель – доктор исторических наук, профессор, академик НАН Беларуси А. А. Коваленя) подпрограммы № 1 «История» (научный руководитель – кандидат исторических наук, доцент В. Л. Лакиза), задание 12.1.7. «Научно-организационное сопровождение государственной программы научных исследований "Общество и гуманитарная безопасность белорусского государства"» (научный руководитель – кандидат исторических наук, доцент М. В. Глеб).*

**ISBN 978-985-08-3106-4**

© Институт истории НАН Беларуси, 2024
© Оформление. РУП «Издательский дом «Беларуская навука», 2024

**Elena Dubovik, Aliaksandr Dubovik**

*Belarusian National Technical University, Minsk, Republic of Belarus*
*E-mail: Dubovik.elena@inbox.ru, a.k.dubovik@mail.ru*

## TRADE UNION ORGANIZATION OF SCIENTIFIC WORKERS IN SOVIET BELARUS (20–30s OF THE XX CENTURY)

The article deals with the creation in 1921 and the activities of section of scientific workers in the trade union of educational workers as a professional organization of the scientific and pedagogical intelligentsia. Data on the growth in the number of members of this organization in Soviet Belarus in the 1920s – early 1930s, on the work of the section central bureau headed by a famous scientist S. Wolfson, about the holding congresses and conferences of scientific workers are given.

***Kew words*:** Soviet Belarus; trade union of educational workers; section of scientific workers; congresses and conferences of scientific workers; trade union of workers of higher education and scientific institutions.

*Дата поступления: 18.03.2022*

УДК 930.2(474.5)"15"+327(4)(091)

**А. І. Дзярновіч**

*Інстытут гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, Мінск, Рэспубліка Беларусь*
*E-mail: Aleh.dziarnovich@gmail.com*

## МЕТРЫКА ВЯЛІКАГА КНЯСТВА ЛІТОЎСКАГА ЯК ДАСЛЕДЧАЯ І ПАЛІТЫКА-ДЫПЛАМАТЫЧНАЯ ПРАБЛЕМА Ў 1920-х ГАДАХ

Пасля геапалітычных катаклізмаў і адміністратыўна-тэрытарыяльнага перападзелу ў Еўропе, выкліканымі палітычнымі наступствамі Першай сусветнай вайны і рэвалюцыямі, Метрыка ВКЛ стала разглядацца як рэсурс памяці і сімвалічнае ўвасабленне дзяржаўнасці. Такія падыходы былі ўласцівы ў Беларусі, Польшчы, Літоўскай рэспубліцы, але закранылі таксама інтарэсы Расіі (РСФСР). У сувязі з гэтым адносна знаходжання самой Метрыкі ВКЛ на працягу 1920-х г. узнікалі навуковыя і палітычныя дыскусіі. У БССР гэта праблематыцы надавалі пільную ўвагу як прадстаўнікі навуковай грамадскасці, так і прадстаўнікі ўлады.

***Ключавыя словы*:** Метрыка ВКЛ; Рыжскі мірны дагавор 1921 г.; Першая Усебеларуская канферэнцыя архіўных работнікаў 1924 г.; Першы з'езд даследчыкаў беларускае археалогіі і археаграфіі 1926 г.

Тэма Метрыкі ВКЛ мае некалькі прачытанняў – крыніцазнаўчае, архівазнаўчае, археаграфічнае, таксама ў рамках праблематыкі функцыянавання дзяржаўных огранаў улады ВКЛ XV–XVIII ст. Пры тым, што матэрыялы Метрыкі – гэта канцылярскія дакументы, сам лёс архіву Канцылярыі ВКЛ здольны абудзіць немалыя дыскусіі, скіраваныя з сучаснаці ў мінулае. Але ж у 1920-х гг. вакол Метрыкі ВКЛ узнікалі яшчэ і сюжэты, якія мелі непасрэднае палітычнае гучанне.

Тут трэба зрабіць кароткі экскурс ў канец XVIII ст., калі пад ударамі знешняй агрэсіі і з-за ўнутранай дысфункцыі пала Рэч Паспалітая. Аказалася, што пры падзелах дзяржавы яе дакументальная і архіўная спадчына мае не толькі палітычна-сімвалічнае значэнне. Архівы – гэта таксама інфармацыйна-адміністрацыйны рэсурс, бо дазваляе адсочваць і рэгуляваць зямельныя наданні, маёмасныя правы, сямейныя сувязі... Яшчэ ў артыкуле XII трактата Абарончага саюзу, заключанага 3 чэрвеня 1792 . у Санкт-Пецярбурзе паміж Расіяй і Аўстрыяй было зазначана, што ўсе «трафеі і ўсялякая здабыча, аднятая ў непрыяцеля, павінна належыць тым войскам, якія яе возьмуць» [1, с. 203]. Пасля ўзяцця войскамі Аляксандра Суворава Варшавы, Кацярына II 21 лістапада (2 снежня) 1794 г. выдала ўказ, пункт 5 якога патрабаваў канфіскаваць і перавезці ў Пецярбург архівы Кароны Польскай і Вялікага Княства Літоўскага, у тым ліку Метрыку ВКЛ: «...надлежит, однако ж, взять и сюда доставить регалии, какие там найдутся, також знаки чинов короны Польской и Великого княжества Литовского, как-то: гетманские булавы, знамена, бунчуки, печати, маршалские жезлы и прочее тому подобное, а равным образом все гражданские и политические архивы их, как-то: оба архива – Коронный и Литовский, именуемые Метрики, архивы, могущие быть в домах бывших непременного Совета и Стражи; особенно в Королевском замке имеющийся древний архив, так называемый Кабинет королей польских, и публичную библиотеку, Залуского именуемую» [2, арк. 157–164; 3, с. 42].

Фактычна, паводле расійскіх даследчыкаў У. Дзякава і Ю. Штакельберга, гэта была «дэталёвая праграма разрабавання культурных каштоўнасцяў пераможанай краіны» [3, с. 42]. Такім чынам,

Метрыка ВКЛ апынулася спачатку ў Санкт-Пецярбургу, а потым на працягу 1887–1888 гг. была перавезена ў Маскву, дзе ад 1939 г. складае фонд № 389 Расійскага Дзяржаўнага Архіва Старажытных Актаў [4] (Пасольскія кнігі Метрыкі былі дастаўленыя ў Маскву яшчэ ў 1828 г.).

Ужо ў 1920 г., у сітуацыі імклівых змен на тэрыторыі заходняй часткі Расійскай імперыі, калі паўставалі і знікалі з палітычнай карты цэлыя дзяржавы, праблема гістарычнай спадчыны актуалізоўвалася практычна на ўсіх дыпламатычных перамовах. Новыя краіны шукалі ды адстойвалі гістарычную легітымнасць свайго існавання, былыя ўладары не жадалі губляць кантроль над рэсурсам памяці. Метрыка ВКЛ абсалютна патрапіла ў гэты палемічны кантэкст.

Дзеяч беларускага нацыянальнага руху ў Рызе Канстанцін Езавітаў прыгадвае абставіны аднаго беларуска-літоўскага інцыдэнту, што мае дачыненне да Метрыкі ВКЛ. Вясной 1920 г. праездам з Коўна ў Маскву ў Рызе на мірных перамовах з РСФСР спынілася літоўская дэлегацыя. У яе склад уваходзіў тагачасны міністр па беларускіх справах у літоўскім урадзе Дамінік Сямашка. Гэтым часам у Рызе знаходзіўся таксама старшыня эміграцыйнага ўраду Беларускай Народнай Рэспублікі Вацлаў Ластоўскі. Адным з пунктаў перамоваў палітыкаў быў лёс Метрыкі ВКЛ. Міністр Д. Сямашка паводле даручэння свайго ўраду паспрабаваў атрымаць згоду Ластоўскага на перадачу Метрыкі ў Коўна – у тых варунках гэта магло азначаць усяго толькі падтрымку захадаў літоўскага ўраду на будучых перамовах у Маскве. Першапачаткова старшыня эміграцыйнага ўраду адмовіўся падпісаць падобны дакумент. Але Д. Сямашка ў чарговы раз звярнуўся да гэтай тэмы і канцылярыя В. Ластоўскага падрыхтавала «дамову», у якой урад БНР пагаджаўся на перадачу літоўскаму боку тых матэрыялаў Метрыкі ВКЛ, якія былі напісаныя на літоўскай мове, а літоўскі ж бок адмаўляўся ад тых дакументаў, што былі створаныя па-беларуску. Дамініку Сямашку не хапіла кампетэнцыі і ён падпісаў падобную «дамову». Потым, паводле Езавітава, гэты дакумент выклікаў канфуз і кпіны на перамовах у Маскве [5, с. 4]. Усё ж гэтая гісторыя, якая набыла пэўныя рысы фальклору сярод

беларускіх гісторыкаў, паказвае, што да рэалій эпохі Вялікага Княства Літоўскага не варта падыходзіць з пазіцыі мадэрнай сучаснасці.

Сюжэт дыскусіі вакол Метрыкі атрымаў працяг у маі 1924 г. на Першай Усебеларускай канферэнцыі архівістаў. Адну з найбольшых дыскусій выклікаў даклад вядомага гісторыка Уладзіміра Пічэты пра ўплыў дамоваў, заключаных Савецкай Расіяй з Польшчай і балтыйскімі дзяржавамі на лёс беларускіх архіваў. Рэч у тым, што У. Пічэта з'яўляўся экспертам у Спецыяльнай Змешанай (расійска-ўкраінска-польскай) Камісіі і быў добра інфармаваны пра абставіны рэалізацыі Рыжскай мірнай дамовы з Польшчай у сферы культурных і гістарычных каштоўнасцяў [6, с. 240]. У. Пічэта звярнуў увагу на некарыснасць артыкула XI Рыжскай дамовы, пункт 4 якой прадугледжваў, што «Расія і Украіна вяртаюць Польшчы вывезеныя з тэрыторыі Польскай Рэспублікі, пачынаючы з 1 студзеня 1772 г., і якія адносяцца да тэрыторыі Польскай Рэспублікі архівы, рэгістратуры, архіўныя матэрыялы, справы, дакументы, рэестры, карты, планы і чарцяжы, роўна як друкаваныя дошкі і клішэ, адбіткі пячатак і друку і т. п. усялякіх органаў і ўстаноў дзяржаўных, самакіравання, грамадскіх і духоўных» [7, с. 352]. Асобна было таксама пазначана: «Тыя ж з вышэйпералічаных прадметаў, якія, хоць і не ставяцца цалкам да тэрыторыі цяперашняй Польскай Рэспублікі, але не могуць быць падзеленыя, вяртаюцца Польшчы». Паводле У. Пічэты, менавіта гэты пункт Дамовы стаў для польскага боку падставай патрабаваць перадачы Метрыкі ВКЛ.

Тут яшчэ трэба звярнуць увагу на адну тэрміналагічную адметнасць польскай мовы. У дачыненні да Польшчы вызначэнне *Рэспубліка* заўжды перадаецца як *Рэч Паспалітая* (*Rzeczpospolita*), адсылаючы гэтым самым дзяржаўную польскую традыцыю да даўніх часоў. Фактычна атрымліваецца: усё, што тычыцца Польскай Рэспублікі роўнае Рэчы Паспалітай. Гэта абсалютна не стасуецца з гістарычнымі і тэрміналагічнымі традыцыямі беларусаў, літоўцаў, украінцаў. Драматызм сітуацыі вакол Рыжскай дамовы ўзмацняўся яшчэ тым, што беларускі бок рэальна не быў прадстаўлены

на гэтых перамовах, на якіх вырашаўся лёс беларускіх зямель і таксама гісторыка-культурнай спадчыны Беларусі.

Распавядаючы пра двухгадовыя дыскусіі паміж польскімі і расійскімі навукоўцамі ды палітыкамі адносна дакументальнай спадчыны ВКЛ, Уладзімір Пічэта прыгадаў таксама, што пытанне пра перадачу Метрыкі ставіла і літоўская дэлегацыя на перамовах з РСФСР, але фармальна юрыдычных правоў у іх было меней, чым у польскай дэлегацыі, якая дамаглася досыць шырокай фармулёўцы ў Рыжскай дамове. Фактычна У. Пічэта пацвердзіў, што сярод літоўскай дэлегацыі не было кампетэнтных спецыялістаў у справе Метрыкі ВКЛ: «На пасяджэнні з літоўцамі пра рэалізацыю дамовы літоўцы паставілі пытанне аб выдачы ім Метрыкі, але дэлегаты Літвы не мелі правільнага ўяўлення пра змест Літоўскай метрыкі». Але калі падчас дыскусіі быў выяўлены сапраўды яе змест, літоўцы прапанавалі арганізаваць камісію для тэхнічнай распрацоўкі кніг і літоўскіх метрык» [8, с. 34]. Пічэта праінфармаваў далей, што «зараз літоўскія навукоўцы працуюць над дакументамі Літоўскай Метрыкі...» І сапраўды, у распрараджэнні афіцыйнай дэлегацыі Літоўскай рэспублікі не было спецыялістаў у справах Метрыкі ВКЛ такога маштабу, якія меліся на баку БССР – М. Доўнар-Запольскага, З. Даўгялы, У. Пічэты.

Але польскі бок у кастрычніку 1923 г. прывозіў у Маскву для «барацьбы» за Літоўскую Метрыку цэлы шэраг навукоўцаў-экспертаў. І тут У. Пічэта дадаў: «Літоўская Метрыка ёсць асноўным матэрыялам па вывучэнні мінулага, культуры Беларусі; адсутнасць яе не дае магчымасці беларускім навукоўцам праводзіць свае даследаванні» [8, с. 35].

На прапанову Змітра Даўгялы была прынятая «Рэзалюцыя па дакладу У. І. Пічэты аб уплыве дагавораў РСФСР з утварыўшыміся дзяржавамі на стан беларускіх архіваў». У гэтым дакуменце было заяўлена, што «прымаючы пад увагу вялікую значнасьць Літоўскай метрыкі як асноўнага грунтоўнага гістарычнага матэр'ялу, застаўшагася ад мінулых часоў Беларускай дзяржавы, без якой не магчыма навуковыя высьляды мінулага Беларусі...,

нарада архіўных працаўнікоў БССР знаходзіць патрэбным даручыць Цэнтрархіву БССР зьвярнуцца ў Ц[энтральны] В[ыканаўчы] К[амітэт] Беларусі з прапазыцыяй прыняць самыя энэргічныя крокі перад ЦВК СССР аб недапушчэньні вывазу беларускіх архіўных матэр'ялаў з тэрыторыі СССР у Польшчу, Латвію, Літву і др. дзяржавы і прыняць меры аб звароце на Беларусь архіўных матэр'ялаў, якія былі вывезены з Беларусі ў дарэвалюцыйны час і ў часы розных акупацый» [8, с. 52].

Фактычна атрымліваецца, што перад пагрозай страціць наўпроставы доступ да архіўных матэрыялаў беларуская навуковагуманітарная грамадскасць БССР у той час выступала за *статускво* – за захаванне вывезенай архіўнай спадчыны ВКЛ, у тым ліку і Метрыкі ВКЛ, надалей у Маскве.

Праўда адносна перадачы Метрыкі ВКЛ Літоўскай рэспубліцы архіўныя ўлады РСФСР маглі пачувацца досыць спакойна, бо паводле артыкула 9 Дамовы ад 12 ліпеня 1920 г. Масква абавязвалася вярнуць у Літву тыя бібліятэкі, музеі і архівы, якія былі вывезены з яе тэрыторыі падчас Першай сусветнай вайны. Што ж тычыцца архіваў, якія былі вывезеныя з яе тэрыторыі да пачатку вайны, то Расія пагаджалася вярнуць іх у тым выпадку, калі гэта «не нанясе істотнай страты расійскім архівам..., у якіх яны захоўваюцца...» [9, с. 34].

Зрэшты, як сведчаць сакрэтныя савецкія дакументы, перахопленыя польскім бокам, савецкі бок не меў намераў аддаваць усю Метрыку ВКЛ таксама Польшчы. Савецкі пасланнік у Варшаве Пётр Войкаў у сваёй справаздачы ад 1924 г. заяўляў: «Таму што паводле Рыжскай мірнай дамове не ўстаноўленыя ніякія санкцыі з нагоды яго невыканання,... пытанні, па якім не дасягнутае пагадненне, застаюцца нявырашанымі. Гэтым самым Літоўская метрыка... [і іншыя фонды] так і застануцца ў нас, і дыпламаты будуць весці па іх перамовы ў горшым выпадку ў бліжэйшыя дзесяцігоддзі» [10, с. 68–69].

Але ў 1925 г. прагучала і іншая прапанова адносна месца захоўвання Метрыкі ВКЛ. Адзін з найбольш вядомых беларускіх гісторыкаў таго часу Мітрафан Доўнар-Запольскі, які ў канцы XIX – пачатку XX ст. апублікаваў шмат матэрыялаў Метрыкі

ВКЛ [11–14], ў 1925 г. у газеце «Савецкая Беларусь» выказаўся наступным чынам: «У цяперашні час матар'ялы Літоўскай Мэтрыкі знаходзяцца ў Маскве. Але з часам, яна безумоўна вернецца да нас. Помнік былой самастойнасці беларускага народу будзе захоўвацца ў нас». Але тут жа вядомы археограф дадае: «Аднак, мала яшчэ таго, каб мець мэтрыку пры сабе, як сваю ўласнасьць. Каштоўныя помнікі не павінны ляжаць дарэмна і пакрывацца пылам у архівах» [15, с. 5].

Дыскусіі Першай Усебеларускай канферэнцыі архівістаў мелі працяг на Першым з'ездзе даследчыкаў беларускай археалогіі і археаграфіі, які адбыўся 17–18 студзеня 1926 г. таксама ў Мінску. У першай рэзалюцыі з'езду ўтрымліваўся зварот да ўраду БССР з заклікам пакінуць Метрыку ВКЛ (Літоўскую Метрыку) у межах СССР, бо яна «з'яўляецца гістарычнай уласнасцю працоўных Беларусі» [16, с. 5]. Далей у Рэзалюцыі была спасылка на тое, што маецца прынцыповая згода адпаведных органаў Расіі перадаць Метрыку ВКЛ у Беларусь і што гэты працэс варта паскорыць.

У трэцім пункце Рэзалюцыі з'езду былі зроблены важныя заяўкі адносна археаграфічнага засваення Метрыкі: «...зьезд лічыць: а) безумоўна неабходным выданьне Літоўскай мэтрыкі ў друку ў мэтах даступнасьці яе для шырокіх колаў грамадзянства і найбольшага навуковага яе скарыстаньня» [16, с. 5].

У «Працах» з'езду быў таксама выдадзены артыкул ужо вядомага на той час беларускага гісторыка Змітра Даўгялы «Літоўская Мэтрыка і яе каштоўнасьць для вывучэньня мінуўшчыны Беларусі» [17, с. 53–59]. Аўтар сцвярджаў: «Якое-б пытаньне закрануць па гісторыі Беларусі соцыяльна-грамадзкага, эканамічнага і іншага зьместу ад XIV да канца XVIII сталецьця, мы напэўна знойдзем заўсёды найлепшыя веды ў Літоўскай Мэтрыцы». І далей: «Вось факт: толькі з таго недалёкага часу, як пачалося вывучэньне Літоўскай Мэтрыкі і яе распрацоўка, пачала існаваць і навуковая гісторыя беларускага народу». Гэты артыкул з выкладам гісторыі і складу Метрыкі стаў вельмі папулярны і потым двойчы яшчэ перадрукоўваўся – «Беларускім выдавецтвам у Латвіі» (Рыга) у 1933 г. [5] асобнай брашурай і ўжо ў наш час у часопісе «Спадчына» [18, с. 85–95].

Літоўскі даследчык Артурас Дубоніс у гэтай сувязі заўважае, што тэма Метрыкі ВКЛ зноў стала актуальнай з-за перамоваў адносна падпісання пакта пра ненападзенне паміж СССР і Літвой, якія адбываліся на працягу 1925–1926 гг. і што ініцыятыва пра агучванне беларускіх прэтэнзій паступіла з Масквы – гэта была яе абарончая рэакцыя ў перамовах з Літвой [19, с. 24–25]. З версіяй ініцыятывы Народнага камісарыяту замежных спраў (НКЗС) СССР у дыскусіі вакол Метрыкі ВКЛ схільны пагадзіцца і беларускі даследчык Міхаіл Шумейка [20, с. 4; 21, с. 175–176], які ў якасці ўскоснага аргумента прыводзіць ліст старшыні Саўнаркаму БССР Язэпа Адамовіча ў Аддзел Прыбалтыкі НКЗС СССР ад 9 лістапада 1926 г. У лісце паведамлялася, што СНК БССР заслухаў з дакладам рэктара БДУ праф. Пічэту і пастанавіў прасіць НКЗС «воздержаться от передачи Литве так называемой Лит. Метрики ввиду того, что БССР имеет все исторические и практические основания для получения этой Метрики» [22, с. 257].

Як бачым, у сітуацыі з рэстытуцыяй (вяртання) Метрыкі ўлады БССР вырашылі выкарыстоўваць прынцып *пертыненцыі*, які ўлічваў адносіны дакументаў да той ці іншай тэрыторыі. Больш кансерватыўны прынцып *правіненцыі* бярэ пад увагу паходжанне дакументаў. А на базе апошняга савецкія ўлады маглі адмаўляць у перадачы Метрыкі Літоўскай рэспубліцы, бо ў той час Вільня не кантралявалася гэтай дзяржавай, а знаходзілася пад уладай Польшчы. Між іншым, у снежні 1925 г. польскія гісторыкі на сваім з'ездзе ў Познані прынялі рэзалюцыю з патрабаваннем перадаць Літоўскую Метрыку Польшчы.

Відавочна з гэтымі дыскусіямі і ініцыятывамі таксама была звязаная прапанова па стварэнні *Інстытута па захаванні і вывучэнні Літоўскай Метрыкі*, што ўтрымлівалася ў Дакладной запісцы Наркамата асветы (Міністэрства асветы) «Аб Літоўскай Метрыцы», накіраванай ва ўрад БССР у 1927 г. [23, с. 97–98]. Трэба адзначыць, што названая прапанова разглядалася яе аўтарамі як кампрамісны варыянт вырашэння спрэчак вакол Метрыкі, бо прадугледжвала кіраванне і ўтрыманне Інстытуту урадамі зацікаўленых дзяржаў «на аснове асобнае згоды па гэтым пы-

таньні». Планавалася, што Інстытут выдасць Метрыку «ў скарочаным выглядзе» прыблізна ў 100 тамах. Прычым дакументы дзяржаўна-палітычнага зместу, а таксама эканамічнага і сацыяльна-культурнага характару меркавалася публікаваць цалкам, а матэрыялы «прыватнага зместу» – у кароткім пераказе. Паводле прыблізных падліках планаваныя 100 тамоў мусілі быць выдадзеныя на працягу 20 гадоў – па 5 тамоў у год [20, с. 11].

У праекце Пастановы ураду БССР «Аб Літоўскай Метрыцы», які захоўваецца ў архіве разам з названай дакладной запіскай, пераказваліся ўсё тыя ж арганізацыйныя прапановы. Але асобна адзначалася, што ўтварэнне Інстытута вырашае пытанні тактычнага характару, бо задача ёсць «пазьбегнуць канфліктаў з замежнымі дзяржавамі на грунце іх дамаганьняў аб выдачы Літоўскай мэтрыкі» [20, с. 11–12]. З тэкстаў дакументаў не робіцца дакладна зразумелым, дзе мусіў быў паўстаць гэты Інстытут. Але не будзем забывацца, што сама Літоўская Метрыка захоўвалася ўсё ж у Маскве.

Магчыма, гэты праект афіцыйнага Мінска меў нейкія шанцы на рэалізацыю, бо 1920-я гг. былі адзначаныя ў БССР інстытуцыянальным развіццём, а сам той час пазначаны ў беларускай гісторыі як «перыяд беларусізацыі». Але, хутчэй за ўсё, ідэя гэтага праекту была ўтапічнай – наўрад ці б улады пайшлі на стварэнне падобнай вузкапрофільнай інстытуцыі ў той перыяд, калі стаяла задача ўтварэння ўласна Беларускай Акадэміі Навук.

Але палеміка і праекты 1920-х гг. мелі свой пазітыўны вынік у ажыўленні выдання Метрыкі ў Беларусі. Ужо вядомы нам Зміцер Даўгяла ў рамках праекту «*Беларускі архіў*» падрыхтаваў асобны том, які цалкам складаўся з Кнігі запісаў № 16 Метрыкі ВКЛ [24]. З. Даўгяла яшчэ да рэвалюцыі 1917 г. быў вядомы як кваліфікаваны археограф, але выданне «Беларускага архіву» ўважаецца за вяршыню яго рэдактарскай і крыніцазнаўчай дзейнасці [25, с. 254].

Усё ж гэтым амбітным планам па вывучэнні і выданні Літоўскай Метрыкі ў БССР не было дадзена здзейсніцца. Да канца 1930-х гг. сышла з арэны плеяда вялікіх беларускіх гісторыкаў

і археографаў, якія займаліся вывучэннем і публікацыяй матэрыялаў Метрыкі – гэтыя навукоўцы былі ці рэпрэсаваныя, як Змітро Даўгяла, ці проста адхілены ад заняткаў гісторыяй Беларусі і Вялікага Княства Літоўскага, як Мітрафан Доўнар-Запольскі.

Тым не менш, узнятыя ў той час дыскусіі вывелі на міжнародны ўзровень праблематыку Метрыкі ВКЛ, якая была асэнсавана як атрыбут дзяржаўнасці. Пазіцыі беларускіх даследчыкаў былі вельмі заўважнымі ў той час. Фактычна яны былі лідэрамі ў вывучэнні матэрыялаў Канцылярыі ВКЛ. Актывізацыю працы над Метрыкаю ВКЛ, якая адбылася ў 1980–1990-х, як і новыя міжнародныя праекты адносна яе вывучэння і выдання, варта звязваць таксама з намаганнямі 1920-х гг.

## Спіс крыніц і літаратуры


1. Собрание трактатов и конвенций, заключенных Россиею и иностранными державами : в 15 т. / сост. Ф. Ф. Мартенс. – СПб. : Типогр. М-ва путей сообщения, 1875. – Т. 2: Трактаты с Австрией, 1772–1808 гг. – 532 с.
2. Российская национальная библиотека (РНБ). – Отдел рукописей. – Ф. 755. Т. 1. Арк. 157–164.
3. Дьяков, В., Штакельберг Ю. Варшавские трофеи / В. Дьяков, Ю. Штакельберг // Родина. – 1994. – № 12. – С. 41–44.
4. Российский государственный архив древних актов (РГАДА). – Ф. 389 (Литовская метрика). Оп. 1. Ч. 1. Д. 1–586.
5. Даўгяла, З. Літоўская Мэтрыка і яе каштоўнасьць для вывучэньня мінуўшчыны Беларусі / З. Даўгяла. – Рыга : Беларус. выд-ва ў Латвіі, 1933. – 16 с.
6. Шумейко, М. Ф. Белорусская археография в XIX–XX вв. (Проблемы теории, истории, методики) / М. Ф. Шумейко. – Минск : БелНИИДАД, 2007. – 496 с.
7. Мирный договор между Россией и Украиной с одной стороны и Польшей – с другой (подписан в г. Риге 18 марта 1921 г.) // Собрание узаконений и распоряжений правительства за 1921 год. – М. : Управление делами Совнаркома СССР, 1944. – С. 343–369.
8. Первая Всебелорусская конференция архивных работников. 12–15 мая 1924 г. Документы и материалы / сост. М. Ф. Шумейко. – Минск : БелНИИДАД, 1999. – 148 с.
9. Документы внешней политики СССР : в 26 т. / М-во иностр. дел СССР. – М. : Госполитиздат, 1959. – Т. III : 1 июля 1920 г. – 18 марта 1921 г. – 743 с.
10. Встретимся в древлехранилище. Круглый стол журнала «Mówią wieki» // Родина. – 1994. – № 12. – С. 68–72.

11. Документы Московского архива Министерства юстиции / подготовил М. В. Довнар-Запольский. – М. : Т-во тип. А. И. Мамонтова, 1897. – Т. 1. – 596 с.

12. Литовские упоминки татарским ордам: скарбовая книга Метрики Литовской 1502–1509 гг. / сост. М. В. Довнар-Запольский. – Симферополь : Типография Спиро, 1898. – 99 с.

13. Акты Литовско-Русского государства / изданы М. В. Довнар-Запольским. – М. : Университетская типография, 1900. – Вып. 1 (1390–1529). – XII, 258 с.

14. Довнар-Запольский, М. Старинные описи Литовской Метрики / М. Довнар-Запольский. – СПб. : тип. Имп. Акад. наук, 1901. – [2], 9 с.

15. Доўнар-Запольскі, М. Літоўская мэтрыка / М. Доўнар-Запольскі // Савецкая Беларусь. – 1925. – 24 снежня. – С. 5.

16. Працы Першага зьезду дасьледчыкаў беларускае археолёгіі і археографіі. 17–18 студзеня 1926 г. – Менск : Інстытут Беларускае Культуры, 1926. – 86 с.

17. Даўгяла, З. Літоўская Мэтрыка і яе каштоўнасьць для вывучэньня мінуўшчыны Беларусі / З. Даўгяла // Працы Першага зьезду дасьледчыкаў беларускае археолёгіі і археографіі. 17–18 студзеня 1926 г. – Менск : Інстытут Беларускае Культуры, 1926. – С. 53–59.

18. Даўгяла, З. Літоўская Мэтрыка і яе каштоўнасьць для вывучэньня мінуўшчыны Беларусі / З. Даўгяла // Спадчына. – 1997. – № 4. – С. 85–95.

19. Дубоніс, А. Праблемы Літоўскай Метрыкі : погляд з Вільнюса / А. Дубоніс // Metriciana: Даследаванні і матэрыялы Метрыкі Вялікага Княства Літоўскага. – 2003. – Т. II. – С. 24–25.

20. Шумейко, М. Ф. «Страсти по Метрике»: попытка создания в 1920-я гг. международного Института по изучению и публикации Литовской Метрики / М. Ф. Шумейко // Беларускі археаграфічны штогоднік. – Мінск : БелНДІДАС, 2003. – Вып. 4. – С. 3–12.

21. Шумейко, М. Ф. Первый съезд исследователей белорусской археологии и археографии. 1926 год / М. Ф. Шумейко // Археографический ежегодник за 2007–2008 гг. – М. : Наука, 2012. – С. 171–180.

22. Знешняя палітыка Беларусі. Зборнік дакументаў і матэрыялаў : у 10 т. – Мінск : б. м. в., 1999. – Т. 2 : 1923–1927 гг. / склад.: У. М. Міхнюк, У. К. Ракашэвіч, Я. С. Фалей, А. В. Шарапа; МЗС РБ, БНДІДАС. – 461 с.

23. Шумейка, М. Гісторыка-прававыя і маральна-этычныя аспекты рэстытуцыі ў адносінах да беларускіх архіваў / М. Ф. Шумейко // Архівы і справаводства. – 2000. – № 4. – С. 97–98.

24. Беларускі архіў : у 3 т. / склад., уступ. арт. З. Даўгяла. – Менск : Інстытут беларускай культуры, 1928. – Т. 2 : Літоўская метрыка (XV–XVI ст.). – 343 с.

25. Улащик, Н. Н. Очерки по археографии и источниковедению истории Белоруссии феодального периода / Н. Н. Улащик. – М. : Наука, 1973. – 303 с.

**Aleh Dziarnovich**

*Institute of History National Academy of Science of Belarus,*
*Minsk, Republic of Belarus*
*E-mail: Aleh.dziarnovich@gmail.com*

## METRICS OF THE GRAND DUCHY OF LITHUANIA AS A RESEARCH AND POLITICAL-DIPLOMATIC PROBLEM IN THE 1920s

After the geopolitical cataclysms and administrative-territorial redistribution in Europe caused by the political consequences of the First World War and revolutions, the Metrica of the Grand Duchy of Lithuania (the Metrica of the GDL; the Lithuanian Metrica) came to be seen as a memory resource and a symbolic embodiment of statehood. Such approaches were inherent in Belarus, Poland, and the Republic of Lithuania, but also affected the interests of Russia (RSFSR). In this regard, academic and political debates arose during the 1920s regarding the whereabouts of the the Metrica of the GDL itself. In the BSSR, both representatives of the scientific community and representatives of the government paid close attention to this problem.

***Keywords***: the Metrica of the Grand Duchy of Lithuania (the Lithuanian Metrica); Peace of Riga (1921); The First All-Belarusian Conference of Archive Workers (1924); The First Congress of Researchers of the Belarusian Archeology and Archeography (1926).

*Дата поступления: 20.03.2022*

УДК 371.13

**А. Г. Казак, А. У. Кімбар**

*Беларускі дзяржаўны эканамічны ўніверсітэт,*
*Мінск, Рэспубліка Беларусь*
*Мінскі гарадскі педагагічны каледж, Мінск, Рэспубліка Беларусь*
*E-mail: olegkazak90@tut.by, andrejkimbar@gmail.com*

## ПАМІЖ ІНСТЫТУТАМ БЕЛАРУСКАЙ КУЛЬТУРЫ І МІНСКІМ БЕЛАРУСКІМ ПЕДАГАГІЧНЫМ ТЭХНІКУМАМ

У артыкуле разглядаюцца розныя аспекты жыццёвых і творчых біяграфій вучоных, якія ў 1920-я гг. сумяшчалі працу ў Беларускім дзяржаўным універсітэце з выкладчыцкай дзейнасцю ў Мінскім беларускім педагагічным тэхнікуме.

# СОДЕРЖАНИЕ

**Предисловие** . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 3

Р а з д е л 1. **История академической науки Беларуси и мира**

*Ерошевич А. В.* Белорусско-русские связи академической науки (конец XVIII – первая половина XIX в.) . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 5

*Новік Н. Я.* Правядзенне навуковых даследаванняў у навучальных установах беларуска-літоўскіх губерняў у першай палове XIX ст. . . . . . . . . . 18

*Бровина А. А.* Институционализация академической науки в контексте освоения северных территорий России в конце XIX – первой половине XX в. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 28

*Яноўскі А. А.* Інстытуцыяналізацыя беларускай навукі ва ўмовах грамадска-палітычных працэсаў 1920-х гг. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 41

*Глеб М. В.* Институт белорусской культуры: особенности исследовательской стратегии . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 52

*Глеб М. В., Жилинская И. В.* Всесоюзное общество культурной связи с заграницей и международный научный обмен СССР в 1920–1930-е гг. . . . 61

*Шадыро В. И.* Инбелкульт и развитие белорусской археологии в 20–30-х гг. XX в. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 78

*Дубовик А. К.* Деятельность ассоциации научной организации труда при институте белорусской культуры . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 85

*Дубовик Е. А., Дубовик А. К.* Профессиональная организация научных работников советской Беларуси (20–30-е гг. XX в.) . . . . . . . . . . . . . . . . . 95

*Дзярновіч А. І.* Метрыка Вялікага Княства Літоўскага як даследчая і палітыка-дыпламатычная праблема ў 1920-х гг. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 105

*Казак А. Г., Кімбар А. У.* Паміж Інстытутам беларускай культуры і Мінскім беларускім педагагічным тэхнікумам . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 116

*Віцязь С. П., Мядзведзева В. У., Дучыц Л. У.* Да пытання аб гістарыяграфіі Інстытута беларускай культуры . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 127

*Бабарыка-Амельчанка В. Б.* Навукова-арганізацыйная дзейнасць Акадэміі навук БССР па ўпарадкаванні беларускай тэрміналогіі (1950-я – 1960-я гг.) . . . . . 142

*Жук С. А.* Развитие правовых оснований комплектования академической аспирантуры АН БССР (середина 1950-х – середина 1960-х гг.) . . . . . 151

*Жук В. Н.* Академия сельскохозяйственных наук БССР: обзор белорусской историографии . . . . . 160

*Мазец В. Г.* Развіццё аграрнай навукі Рэспублікі Беларусь у адлюстраванні дакументаў Цэнтральнага навуковага архіва НАН Беларусі . . . . . 170

*Белозорович В. А.* Самопрезентация отечественной истории в академических национально-государственных нарративах XX – начала XXI в. . . . . . 179

*Краснова М. А.* Белорусская историческая наука и становление школьного учебного книгоиздания по истории в Республике Беларусь . . . . . 186

*Дрожжа Л. Ч.* Актуальныя праблемы перыядызацыі і метадаў гістарычных даследаванняў у беларускай гістарычнай навуцы . . . . . 198

Раздел 2. **Личность ученого: подходы и практика изучения**

*Егорова С. Л.* Биографический метод как инструмент изучения личности ученого (по документам личного архивного фонда А. Е. Ванеева) . . . . . 209

*Филиппова Т. П.* Академик Е. С. Федоров (1853–1919): новаторство и практика экспедиционной деятельности . . . . . 219

*Бароўская В. М.* Дзейнасць У. І. Пічэты ў складзе змешанай спецыяльнай камісіі 1921–1929 гг. . . . . . 228

*Шишкина К. Г.* Е. Ф. Карский и В. Ягич: Варшава – Вена . . . . . 237

*Бондарь Л. Д.* Академик Е. Ф. Карский и его деятельность по организации международного сотрудничества . . . . . 246

*Ершова О. И.* Академик Павел Яковлевич Панкевич – педагог-теоретик и организатор белорусской науки . . . . . 258

*Каплиев А. А.* Руководитель медицинской секции Института белорусской культуры Михаил Иванович Барсуков (1890–1974) у истоков советской системы здравоохранения . . . . . 269

*Рзаева Ж. В.* Дзейнасць М. В. Азбукіна ў Інбелкульце . . . . . 282

*Бараноўскі А. В.* Д. Ф. Прышчэпаў – арганізатар айчыннай сельскагаспадарчай і лясной навукі . . . . . 293

*Рощевская Л. П.* Репрессированные белорусские деятели науки в Коми АССР (1930 – середина 1950-х гг.) . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 301

*Настусевич С. В.* Вклад И. Л. Беленького в дисциплинарное становление биографики в российской исторической науке . . . . . . . . . . . . . . . . . . 310

*Ерохин В. Н.* Артур Джеффри Диккенс (1910–2001) и современное понимание истории английской реформации . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 318

*Чикалова И. Р.* Минский историк Рахиль Абрамовна Никольская (1904–2004) в окружении семьи и коллег . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 327

*Гурын А. В., Мазарчук Д. В.* Творчы шлях гісторыка-міжнародніка ў беларускай навуцы (памяці Ю. Я. Івоніна) . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 335

**Сведения об авторах** . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 343